*Крок да прафесіі*

# КВЭСТ ДЛЯ БУДУЧЫХ «АЙЦІШНІКАЎ»

**Дзень БДУІР прайшоў у Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня».**

— Зараз на змене знаходзяцца школьнікі з 7-га па 11-ты клас, якія праявілі сябе ў тэхнічнай творчасці. Яны могуць стаць нашымі патэнцыяльнымі абітурыентамі, таму стаяла задача як мага больш цікава і захапляльна расказаць пра наш універсітэт, каб дзецям захацелася ў нас вучыцца, — расказала **кіраўнік прэс-службы ўніверсітэта Ала БАЯРКА.** — Такім чынам быў дадзены старт прыёмнай кампаніі 2016 года...

Насычаную праграму дня склалі майстар-класы, выставы, гульні і конкурсы. Выхаванцы «Зубраняці» збіралі кубік Рубіка, гулялі ў «Што? Дзе? Калі?» і «Мелатрэк», а таксама праслухалі лекцыю пра нанаматэрыялы і нанатэхналогіі. Маладзёжнае ТБ БДУІР арганізавала для падлеткаў фотазону і конкурс сэлфі, а рэдакцыя ўніверсітэцкай газеты «Імпульс» заахвочвала фірменнымі ручкамі і нататнікамі за хуткаснае складанне «пазлаў» першай паласы.

Вучняў выпускных класаў, у першую чаргу, цікавілі спецыяльнасці, умовы паступлення і навучання. Пра сябе школьнікам расказвалі прадстаўнікі адразу трох факультэтаў: камп'ютарных сістэм і сетак (ФКСІС), камп'ютарнага праектавання (ФКП) і факультэта радыётэхнікі і электронікі (ФРЭ). Таксама адбыліся каля дзесяці майстар-класаў. Асобна варта адзначыць квэст па гісторыі БДУІР, які правялі прадстаўнікі Студэнцкага савета БДУІР — Мікіта Дубко і Ірына Дораш.

Ключавым конкурсам стала напісанне эсэ на тэму «Хачу стаць студэнтам БДУІР». Усе працы былі непасрэдна на месцы правераны журы, і Дзень БДУІР завяршыўся цырымоніяй узнагароджання пераможцаў конкурсу.







Наступная паездка прадстаўнікоў БДУІР у «Зубраня» адбудзецца ў лютым. Плануецца, што супрацоўніцтва ўніверсітэта з дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтрам будзе пастаўлена на пастаянную аснову.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# ДЗЯЎЧЫНА З БАЙЦОЎСКІМ ХАРАКТАРАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Памятае Амалія, як пайшла зноў на медкамісію, як ёй соты раз сказалі, «з такім зрокам — ніякіх ваенных спецыяльнасцяў».

— Я яшчэ прыйду да вас у форме! — адказала настойлівая дзяўчына.

І прыйшла, калі пасля прысягі ў Гомельскім інжынерным інстытуце Міністэрства па надзвычайных сітуацыях яе адпусцілі дадому.

...Як? Лёс-чараўнік аднойчы ў інтэрнэце завёў Амалію на сайт МНС. І калі яна ўбачыла загаловак «Ліст міністру», то, зразумела, звярнулася да Уладзіміра Аляксандравіча Вашчанкі з просьбай, каб той дазволіў ёй паступаць у ВНУ МНС.

Нарэшце мара Амаліі ажыццявілася: зарадка ў 6 гадзін, ваенная падрыхтоўка, пастаянны кантроль, нарады, 94 чалавекі на курсе, з якіх толькі 8 дзяўчат...

— Самае складанае — доўгі час не бачыць і не чуць родных. Калі ты ведаеш, што цябе чакаюць, любяць — гэта самая лепшая падтрымка ў складаных хвілінах. Цяжка было растлумачыць маёй малодшай сястрычцы Анхеліцы, чаму «забылася» дарогу дадому, чаму не тэлефаную. Яна з крыўдай казала, што я знайшла сабе новую сям'ю, — узгадвае Амалія. — Сястрычка ў нечым мела рацыю. Я знайшла сям'ю — наш вялікі дружны курс. Памятаю, як мы ездзілі на ўборку бульбы: працавалі з раніцы да вечара, а затым збіраліся ля вогнішча, спявалі песні, гулялі ў «мафію». Памятаю, як дапамагалі адзін аднаму ў вучобе. Як з сяброўкай ледзь не засталіся без водпуску, таму што вырашылі павіншаваць аднакурсніка ноччу з днём нараджэння: з тортам, з 18 шарыкамі заявіліся ў казарму...

Час прайшоў хутка, і на пагонах Амаліі сёлета зазіхацелі доўгачаканыя лейтэнанцкія зорачкі, а ў дыпломе з'явіўся запіс — спецыяльнасць «папярэджанне і ліквідацыя надзвычайных сітуацый». А што далей? Як не дзіўна, Амалія яшчэ на першым курсе вырашыла, што вернецца на Астравеччыну.

— Працую ў раённым аддзеле па надзвычайных сітуацыях. За мной замацаваны аб'екты на будоўлі АЭС, дзе я сачу, каб не было парушэнняў па пажарнай бяспецы. Крыху шкада было адмовіцца на размеркаванні ад месца ў Гомельскім ліцэі МНС, бо мне хацелася працаваць з кадэтамі. Памятаю, як яшчэ на практыцы я «дапякла» ўсіх расповедамі пра міжнародны злёт у Гомелі, куды прыехалі юныя ратавальнікі з 15 краін. Падумалася: чаму б на базе Астравецкай сярэдняй школы не арганізаваць кадэцкі клас? Ідэю падтрымалі: цяпер вучу «маіх» кадэтаў хадзіць страявым крокам, аказваць першую медыцынскую дапамогу. Займаемся і пажарным спортам: вучымся падымацца па пажарных лесках, бегаем пажарную эстафету, пераадольваем стаметровую паласу перашкод. Будзем сур'ёзна рыхтавацца да конкурсаў юных ратавальнікаў, каб займаць толькі прызавыя месцы, — з усмешкай расказвае Амалія.



**Міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір Вашчанка дае Амаліі апошнія настаўленні. А яна не забылася падзякаваць за дазвол паступаць у ВНУ МНС.**

У дзяўчыны атрымліваецца ўсё, за што б яна ні ўзялася. Сярод шматлікіх захапленняў можна вылучыць два самых-самых — бег і кнігі.

— Бег дапамагае мне зняць стрэс, прывесці думкі ў парадак; падчас прабежкі нараджаюцца новыя ідэі. Раю ўсім! Нават пяць хвілін — лепшае лякарства, — дзеліцца дзяўчына. — А кнігі прыносяць асалоду. Прывучыла сябе чытаць не менш за 50 старонак раніцай альбо вечарам.

**Нарэшце мара Амаліі ажыццявілася: зарадка ў 6 гадзін, ваенная падрыхтоўка, пастаянны кантроль, нарады, 94 чалавекі на курсе, з якіх толькі 8 дзяўчат...**

Дарэчы, нядаўна няўрымслівая дзяўчына ўдзельнічала ў Мінскім Polo-марафоне і прабегла дыстанцыю ў 21 кіламетр за дзве гадзіны дваццаць пяць хвілін. Адразу ж Амалія паставіла новую мэту — адолець поўную дыстанцыю — 42 кіламетры. Упэўнена, у яе і гэта атрымаецца!

**Юлія БУКЕЛЬ, студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ.**



**Нарэшце на пагонах дзяўчыны зазіхацелі лейтэнанцкія зорачкі.**

*У руху*

## НАШ «ЗЯЛЁНЫ СЛЕД» У ПАРЫЖЫ

**Беларускія школьнікі ў завочнай форме бяруць удзел у кліматычный канферэнцыі ў Парыжы, якая будзе доўжыцца там да 11 снежня.**

Сёлета падлеткі з двух гарадоў — Полацка і Наваполацка — упершыню далучыліся да кампаніі ZOOM «Дзеці ў руху», якая запрашае дзяцей па ўсёй Еўропе здзяйсняць іх паўсядзённыя падарожжы кліматычна дружалюбным спосабам. Збіраючы так званыя «зялёныя сляды», дзеці робяць свой маленькі ўклад у абарону клімату. За паўтара месяца школьнікі сабралі амаль чатыры тысячы такіх «зялёных слядоў» з пажаданнямі да ўдзельнікаў 21-й канферэнцыі бакоў Рамачнай канвенцыі ААН па змяненні клімату, якая праходзіць зараз у французскай сталіцы. «Сляды», зробленыя з каляровай паперы, дзеці атрымлівалі за кожную сваю паездку на грамадскім транспарце, веласіпедзе або прагулку пешшу, за эканомію электраэнергіі і вады.

Усяго 257 падлеткаў з трох школ Полацка і Наваполацка вучыліся больш уважліва ставіцца да экалагічных наступстваў сваіх падарожжаў. Найперш удзельнікі акцыі даведаліся, што выкіды ад аўтамабіляў вельмі шкодныя для іх здароўя, а, значыць, карыстацца асабістым транспартам трэба як мага радзей. Разам з настаўнікамі школьнікі таксама ставілі практычныя доследы, каб зразумець, як дзейнічае парніковы эфект. І як самыя сапраўдныя журналісты бралі інтэрв'ю ў сваіх бацькоў, бабуль і дзядуляў, каб прасачыць, як змянялася гарадская мабільнасць цягам некалькіх пакаленняў.

У Парыж «зялёныя сляды» беларускіх школьнікаў адправіліся разам з прадстаўнікамі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Самыя цікавыя з іх будуць прадстаўлены на канферэнцыі на беларускім стэндзе. Пажаданні дзяцей — своеасаблівы сігнал удзельнікам мерапрыемства прыкласці максімум намаганняў для абароны клімату.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

*Захапляльная навука*

## ЦІ ЗАЦВІТУЦЬ НА МАРСЕ ЯБЛЫНІ?

**Фестываль навукі «Карпарацыя ведаў» праходзіць гэтымі днямі ва ўстановах адукацыі сталіцы: на базе Рэспубліканскага цэнтра інавацыйнай і тэхнічнай творчасці, школ, каледжаў і ВНУ. Мерапрыемства арганізавана пры падтрымцы Міністэрства адукацыі, Дзяржаўнай карпарацыі па атамнай энергіі «Расатам» і Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь.**

«Карпарацыя ведаў» — гэта майстар-класы, адкрытыя лекцыі, панэльныя дыскусіі і навуковыя ток-шоу. З папулярнымі лекцыямі па фізіцы, хіміі, крышталяграфіі, біялогіі, эканоміцы, псіхалогіі, геаграфіі, матэматыцы і гісторыі перад школьнікамі і студэнтамі выступяць беларускія і расійскія вучоныя і эксперты. Тэмы — адна цікавейшая за другую: «Калі на Марсе зацвітуць яблыні?», «Выкарыстанне радыенуклідаў у медыцынскай практыцы», «Вялікія псіхалагічныя эксперыменты: штосьці пайшло не так», «Чалавекператвараецца ў кібарга», «Нобелеўская прэмія вакол нас» і многія іншыя.

Мінскі гандлёвы каледж запрашае 3 снежня на кулінарны майстар-клас «Навука. Смачна», на якім гасцям раскажуць пра нацыянальны беларускі прадукт, яго гісторыю, біяхімічныя ўласцівасці і навучаць гатаваць з бульбы смачныя стравы. А 4 снежня ў Рэспубліканскім цэнтры інавацыйнай і тэхнічнай творчасці адбудзецца прагляд эпізодаў фільма «Марсіянін» з наступным абмеркаваннем: наколькі рэальна тое, што паказана ў фільме, якія тэхналогіі ўжо маюцца, а якія — справа недалёкай будучыні.

Усяго падчас правядзення фестывалю запланавана больш за два дзясяткі мерапрыемстваў. Азнаёміцца з падрабязнай праграмай яго правядзення можна на сайце Рэспубліканскага цэнтра інавацыйнай і тэхнічнай творчасці www.rcitt.by. Уваход на ўсе мерапрыемствы свабодны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*